5. Казаренков В.И., Казаренкова Т. Б. Развитие у студентов потребности в межкультурном взаимодействии //Вестник Российского университета дружбы народов: Серия: Психология и педагогика. – 2010.№1. С.69-73.
6. Казаренков В.И., Казаренкова Т.Б. Творчество педагога в поликультурном образовательном пространстве // Психология образования в поликультурном пространстве. – 2016. № 33(1). С. 60-66.
7. Орлова А.П. Этнопедагогизация образования: подготовка специалистов социальной сферы // Высшая школа: опыт, проблемы, перспективы: Материалы VIII Международной научно-практической конференции: в 2 ч., Москва, РУДН, 15-17 апреля 2015 г. / Науч. ред. В.И.Казаренков – М.: РУДН, 2015. Часть 1. С.168-174
8. Филиппов В.М. Четыре ступени интернационализации: управление процессами интернационализации высшего образования на глобальном, региональном, национальном и институциональном уровнях //Высшее образование сегодня. – 2010.№ 6. С.4-8.
9. Чеботарёва Е.Ю. Роль субъектного благополучия в межкультурной адаптации // Вестник Российского университета дружбы народов: Серия: Психология и педагогика: – 2014. №2. С. 13-17.
10. Kazarenkov V.I., Kazarenkova T.B. University education as a factor of students ' interest in intercultural interaction in modern society // 13th Conference of the European Sociological Association (Un)Making Europe: Capitalism, Solidarities, Subjectivities Abstract book (European Sociological Association) Abstract book. - 2017. - С. 169-185.

**УДК 37.013.8:378.14:364:37.013.43(476)**

# АПЕРАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАДМЕТА ДАСЛЕДАВАННЯ “ЭТНАПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў ПОЛІКУЛЬТУРНЫМ СОЦЫУМЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ”

**А.Л. Міхайлава,**
*ВДУ імя П.М. Машэрава, г.Віцебск*
(e-mail: elena-mikhaylova@rambler.ru)

У сучасным сацыяльным асяроддзі ва ўмовах актыўнага развіцця працэсаў глабалізацыі ва ўсіх сферах грамадскай жыццядзейнасці адбываецца павелічэнне колькасці і інтэнсіўнасці кантактаў з прадстаўнікамі іншых культур і нацыянальнасцей. Не з’яўляецца выключэннем і Рэспубліка Беларусь, геаграфічнае становішча якой, а таксама менталеўтваральныя якасці беларусаў, што характарызуюцца талерантнасцю, гуманнасцю і гасціннасцю, вымагаюць актыўную камунікацыю грамадзян краіны з замежнымі прадстаўнікамі на сацыяльна-бытавым і прафесійным узроўнях. Асаблівую актуальнасць праблема ўзаемадзеяння прадстаўнікоў розных культур і нацыянальнасцей ва ўмовах полікультурнага соцыуму Беларусі набывае ў сферы адукацыі (на розных яе ўзроўнях), у прафесійнай сферы (падчас аказання розных паслуг, у тым ліку сацыяльных), на сацыяльна-бытавым узроўні (асабліва актуальнай будуць камунікацыі такога кшталту падчас арганізацыі Еўрапейскай моладзевай алімпіяды ў г.Мінску). Тыповай прычынай таму з’яўляецца пашырэнне кантынгенту замежных студэнтаў, прытоку мігрантаў і бежанцаў з суседніх краін.

Так, сучасная сацыяльная прастора Рэспублікі Беларусь і яе рэгіёнаў уяўляюць адмысловы полікультурны соцыум, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі розных этнічных груп і народаў, этналінгвістычных, этнасацыяльных і канфесійных супольнасцей, гарадской і сельскай субкультур, розных сацыяльна-эканамічных слаёў насельніцтва. Таму ва ўмовах указанай адмысловай полікультурнай прасторы ўзнікае вострая патрэба падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльнай сферы, здольных не толькі прафесійна вырашаць многія сацыяльныя праблемы прадстаўнікоў розных этнічных груп і народаў, але і паспяхова камунікаваць, знаходзячы агульную мову з імі. Таму, абапіраючыся на змест канцэпцый этнапедагагічнай адукацыі і пераемнасці народнай і

навуковай педагогікі (Г.П. Арлова [4], Г.Н. Волкаў [1], А.Л. Хрыстава [6]), мы лічым, што прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста сацыяльнай сферы павінна арганічна спалучацца з этнакультурнай кампетэнтнасцю як уласцівасцю асобы. Яна выражаецца ў наяўнасці "сукупнасці аб'ектыўных уяўленняў і ведаў пра пэўную культуру і рэалізуецца праз кампетэнцыі (прафесійныя і сацыяльна-асобасныя) і мадэлі паводзін, адпаведныя міжэтнічнаму ўзаемаразуменню і ўзаемадзеянню" [3, с. 10].

Менавіта таму прадметам нашага даследавання выступіла этнапедагагічная падрыхтоўка будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) для работы ў полікультурным соцыуме Рэспублікі Беларусь. Указаны прадмет даследавання выступае ў якасці дамінавальнага параметра ў праграме педагагічнага эксперымента. Дапаможнымі параметрамі з'яўляюцца: ступень этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце); адносіны будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей;гатоўнасць і магчымасці ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) з кліентамі-прадстаўнікамі іншых нацый і культур.

У межах разгляду дапаможнага параметра "ступень этнічнасці будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце)" неабходна вызначыць сутнасць і змест паняцця "этнічнасць". Сам указаны тэрмін і яго асэнсаванне пачалося ў 60-я гады XX стагоддзя ў перыяд узмацнення руху этнічных меншасцей за свае правы ў прамыслова развітых краінах. Тэарэтычнае асэнсаванне дадзенага паняцця ў навуковых працах прывяло да ўзнікнення наступных падыходаў у разуменні этнічнасці: эсэнцыялісцкі – прадугледжвае этнічную ідэнтыфікацыю асобы, заснаваную на глыбокіх сувязях з пэўнай этнічнай групай або культурай (Ю.У. Брамлей, Н. Глейзер, Л.М. Гумілёў, Э. Сапір); інструменталісцкі – паказвае пэўную мабілізацыю і станаўленне этнічнасці як унутры групы, так і па-за яе межамі (Д.Л. Гаравіц); канструктывісцкі – разглядае этнічнасць у сістэме сацыяльных дыспазіцый, на розных узроўнях і кантэкстуальнай накіраванасці (Ф. Барт, І. Валерстайн) [2]. Вышэйзгаданыя падыходы да разумення этнічнасці не з'яўляюцца ўзаемавыключальнымі, таму мы, аб'яднаўшы іх, вылучылі агульныя інтэграцыйныя рысы. Гэта дазволіла прапанаваць свой абагульнены падыход да разумення тэрміна "этнічнасць" і яго зместавых характарыстык. Этнічнасць асобы, у кантэксце праблемы нашага даследавання,"паказвае яе прыналежнасць да пэўнай этнічнай групы або супольнасці праз сукупнасць наступных характарыстык: успрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы і ўсведамленне сваёй адметнасці; наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў, што з'яўляецца асновай для развіцця этнічнасці; уяўленні аб радзіме, духоўных каштоўнасцях, ідэалах і іх рэтрансляцыі праз веданне і выкарыстанне этнапедагагічных сродкаў выхавання" [3, с. 97]. Дыягнастычныя індыкатары вышэйзгаданых паказчыкаў дазволілі нам распрацаваць тэст-апытальнік ступені этнічнасці асобы для экспрэс-дыягностыкі прыналежнасці асобы да свайго народа або этнічнай групы. Ён прадстаўляе сабой аднамерную шкалу, што складаецца з 20 пытанняў, якія адносяцца да розных сфер: успрыняцце сябе ў якасці прадстаўніка этнічнай групы або народа; наяўнасць пераемнай сувязі паміж пакаленнямі сваякоў; веданне этнапедагагічных сродкаў выхавання і ступень авалодання імі. Магчымы дыяпазон тэставага бала – ад 0 да 40 балаў: сума ад 0 да 15 балаў вызначае нізкую ступень этнічнасці асобы; ад 16 да 29 балаў паказвае сярэднюю ступень этнічнасці асобы; сума ад 30 да 40 балаў характэрна для высокай ступені этнічнасці асобы.

Дапаможны параметр "адносіны будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей" уключае ў якасці крытэрыяў сямейныя (паказчыкамі



Рэпазіторый ВДУ

з'яўляюцца "гонар за сваю сям'ю" і "павага да продкаў і шанаванне свайго роду") і грамадскія каштоўнасці (паказчыкі: "працавітасць", "дабрыня і спагада", "чэснасць і праўдзівасць", "любоў да Радзімы, у тым ліку да малой радзімы", "гасціннасць", "павага да роднай мовы", "значнасць меркавання прадстаўнікоў сацыяльнага асяроддзя асобы"). Вылучэнне згаданых паказчыкаў з'явілася магчымым, дзякуючы Ж. Дэвосу, Л. Рамануччы-Рос – прадстаўнікам "культурнага варыянту" прымордыялізму, якія вызначалі сутнасць і змест паняцця "этнічнасць", а таксама дзякуючы даследаванням і канцэпцыям шэрагу вучоных-этнапедагогаў (Г.П. Арлова (Беларусь), В.С. Болбас (Беларусь), Г.Н. Волкаў (Расія, Чувашыя), М.Г. Стэльмаховіч (Украіна), Я.І. Сяваўка (Польшча), Я.І. Ханбікаў (Расія, Казань), А.Л. Хрыстава (Расія)). Намі з мэтай ацэнкі адносін рэспандэнтаў да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей быў распрацаваны апытальнік, які змяшчае ацэнку (па пяцібальнай шкале) дзевяці этнакаштоўнасцей шляхам выстаўлення пэўнага бала па кожным выказванні, наколькі яно характэрна для самога рэспандэнта, для яго мікрасацыяльнага асяроддзя, наколькі неабходным стане для будучых пакаленняў.

Трэцім дапаможным параметрам становіцца "гатоўнасць і магчымасці ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) з кліентамі-прадстаўнікамі іншых нацый і культур". У вылучэнні ўказанага параметра мы абапіраліся на выніکі псіхолага-педагагічных даследаванняў В.В. Грыцэнка, Г.У. Салдатавай, Т.Г. Стэфаненка, І.А. Фурманава, У.А. Янчука па праблематыцы міжкультурнага ўзаемадзеяння. Крытэрыямі вызначэння дадзенага параметра ў кантэксце педагагічнага эксперымента выступаюць "тып этнічнай ідэнтычнасці як паказчык гатоўнасці да ажыццяўлення міжкультурнай і міжэтнічнай камунікацыі", які быў вылучаны і абгрунтаваны Г.У. Салдатавай, С.В. Рыжовай [5] (мы арганізуем даследаванне па стандартнай методыцы згаданых аўтараў "Тыпы этнічнай ідэнтычнасці"), а таксама "гатоўнасць і магчымасці арганізацыі міжкультурнай і міжэтнічнай камунікацыі". Апошні крытэрый быў вылучаны намі на падставе тэорыі міжкультурнай камунікацыі амерыканскага антраполага Э. Хола, вызначаных і абгрунтаваных айчынным псіхолагам В.А. Янчуком фактараў, што аказваюць непасрэдны ўплыў на дасягненне міжкультурнага ўзаемаразумення: матывацыя (само жаданне партнёраў дасягнуць узаемаразумення, значнасць стасункаў), веды (уяўленні пра аб'ект і сітуацыю, дапушчэнне магчымасці больш, чым аднаго пунктаў меркавання), навыкі збору і абнаўлення інфармацыі, карэкцыя ўласных паводзін [7].

Паказчыкі гатоўнасці і магчымасцей арганізацыі міжкультурнай і міжэтнічнай камунікацыі ўключаюць: талерантнасць у адносінах да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей і культур (вызначылі і абгрунтавалі Л.М. Дробіжава, Дз.А. Лявонцьеў, В.Ф. Пятрэнка); гатоўнасць і жаданне арганізоўваць міжкультурную камунікацыю ў межах будучай прафесійнай дзейнасці (згодна абгрунтаваннем міжкультурнай кампетэнтнасці Г.У. Салдатавай, В.А. Янчуком); наяўнасць практычнага вопыту па арганізацыі міжкультурнай камунікацыі (Д. Мацумота). На падставе вылучаных паказчыкаў намі быў распрацаваны апытальнік па праблемах міжэтнічнай і міжкультурнай камунікацыі, які ўключае ў сябе: пытанні розных тыпаў;рэйтынгавую ацэнку рэспандэнтамі рэальных або магчымых стасункаў з прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей / этнічных груп, якія пражываюць альбо навучаюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь альбо рэгіёна (ад аднаго да дзесяці); ацэнку ўзроўня складанасці работы спецыяліста сацыяльнай сферы з кліентамі-прадстаўнікамі іншых культур і нацыянальнасцей па паказчыках цяжкасці (па дзесяцібальнай шкале); самаацэнку наяўнасці і ступені развіцця кампетэнцый і асобасных якасцей, неабходных для арганізацыі міжкультурнай або міжэтнічнай камунікацыі (па дзесяцібальнай шкале).



Рэпазіторый ВДУ

Такім чынам, па выніках праведзенай аперацыяналізацыі прадмета нашага даследавання – этнапедагагічнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў сацыяльнай сферы (сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце) для работы ў полікультурным соцыуме Рэспублікі Беларусь – мы выйшлі на дыягнастычны інструментарый, які дазваляе атрымаць Т-дадзеныя, што фіксуюць паказчыкі дасягненняў па дадзеных аб'ектыўных тэстаў (апытальнік "Тыпы этнічнай ідэнтычнасці" Г.У. Салдатавай, С.В. Рыжовай), Q-дадзеныя, што змяшчаюць інфармацыю пра самаацэнку рэспандэнта (апытальнікі па праблемах міжэтнічнай і міжкультурнай камунікацыі і па ацэнцы адносін да базавых этнапедагагічных каштоўнасцей); L-дадзеныя, што змяшчаюць інфармацыю пра вопыт і прадукты мінулай дзейнасці рэспандэнта (апытальнік па праблемах міжэтнічнай і міжкультурнай камунікацыі, тэст-апытальнік ступені этнічнасці асобы для экспрэс-дыягностыкі прыналежнасці асобы да свайго народа або этнічнай групы).

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Волков, Г.Н. Педагогика национального спасения: избранные этнопедагогические сочинения / Г.Н. Волков. – Элиста: АПП «Джангар», 2003. – 440 с.
2. Идентичность и конфликт в постсоветских государствах: Сборник статей / Под ред. М.Б. Олкотт, В. Тишкова, Д. Малашенко. – М.: Московский Центр Карнеги, 1997. – 490 с.
3. Міхайлава, А.Л. Этнапедагагічная падрыхтоўка спецыялістаў сацыяльнай сферы ва ўмовах полікультурнага соцыуму: тэарэтыка-метадалагічны аспект: Манаграфія / А.Л. Міхайлава. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2018. – 154 с.
4. Орлова, А.П. Этнопедагогическая подготовка в вузе: актуализация разработки концепции и модели / А.П. Орлова / Повышение качества профессиональной подготовки специалистов социальной и образовательной сфер: Сборник научных статей. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2018. – С.3-7.
5. Солдатова, Г.У. Типы этнической идентичности. Психология межэтнической напряженности / Г.У. Солдатова. – М.: Смысл, 1998. – 389с.
6. Христова, Е.Л. Об уточнении понятийного аппарата этнопедагогики [Текст] / Е.Л. Христова // Советская педагогика. – 1989. – № 7. – С. 103-106.
7. Янчук, В.А. Социокультурно-интердетерменистская диалогическая перспектива формирования межкультурной компетентности / В.А. Янчук // Известия Саратовского университета. Серия «Акмеология образования. Психология развития». – 2014. – Т.3. – Вып.3 (II). – С.241-253.


**УДК 37.013.42:37.015.31**

## ОРГАНИЗАЦИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СПЕЦИАЛИСТОВ СОЦИАЛЬНО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ И ПСИХОЛОГИЧЕСКОЙ СЛУЖБЫ УЧРЕЖДЕНИЯ ОБРАЗОВАНИЯ ПО ПРОФИЛАКТИКЕ СЕМЕЙНОГО НЕБЛАГОПОЛУЧИЯ

**Е.К. Погодина,**
*БГПУ имени Максима Танка, г. Минск*
(e-mail: pogodinaek@mail.ru)

Семья – важнейший социальный институт современного общества, основа формирования здоровой белорусской нации. Семья является важнейшим институтом социализации подрастающего поколения.

В настоящее время в Республике Беларусь проживают около 2,7 млн. семей, из них 1,2 млн. (почти 45%) имеют детей в возрасте до 18 лет. Первоочередное право каждого ребенка – иметь семью и достойный уровень жизни в ней. В последние годы в Республике Беларусь принят целый ряд нормативно-правовых актов, направленных на улучшение материального положения семьи и детей, состояния здоровья и системы образования подрастающего поколения. Права и законные интересы детей закреплены

Репозиторий ВГУ